

Download



Вясна / Правы чалавека ў Беларусі

У Жлобіне асудзілі непаўнагадовага за ўдзел у жнівеньскай акцыі пратэсту ў 2020 годзе

Суд Жлобінскага раёна вынес прысуд непаўнагадоваму Л**еону Салдаценку**, якога абвінавацілі ў арганізацыі і падрыхтоўцы дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўным ўдзеле у іх (ч.1 арт. 342 КК). Справу разглядала суддзя **Святлана Андрэева**.

Як устаноўлена ў ходзе судовага следства, непаўнагадовы Салдаценка увечары 9 жніўня 2020 года прыбыў у цэнтральную частку Жлобіна, дзе адбывалася акцыя пратэсту. Па матэрыялах абвінавачання Леон, *«стаяў на праезнай частцы вуліцы Першамайскай і перашкаджаў руху грамадскага і іншага транспарту. Выкрыкваў розныя лозунгі, рабіў гучныя воплескі рукамі і свістаў»*.

У выніку суд прызначыў Салдаценку пакаранне ў выглядзе абмежавання волі на тэрмін 1 год і 6 месяцаў

Context

Embed

View In Channel

```
<script async
src="https://telegram.org/
js/telegram-widget.js?22"
```

Copy